УДК 39+316.7

***Н. В. Петухова,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

# РЭКАНСТРУКЦЫЯ НАРОДНЫХ СВЯТ У СУПРАЦОЎНІЦТВЕ З ФІЛІЯЛАМ КАФЕДРЫ РЭЖЫСУРЫ Ў МУЗЕІ НАРОДНАЙ АРХІТЭКТУРЫ І ПОБЫТУ (в. Азярцо)

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны праблеме рэканструкцыі народных свят супрацоўнікамі і студэнтамі кафедры рэжысуры ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту. Апісаны ўмовы дзейнасці музея, ландшафтныя і рэкрэацыйныя асаблівасці, якія дазваляюць выкарыстоўваць яго тэрыторыю для правядзення мерапрыемстваў гістарычнай і фальклорна-этнаграфічнай тэматыкі. Прааналізаваны шляхі арганізацыі фальклорных мерапрыемстваў: традыцыйны і інавацыйны. Дадзеныя шляхі раскрываюць спецыфіку распрацоўкі сцэнарыяў абрадавых комплексаў у межах музея.

**Ключавыя словы:** музей, фальклор, абрад, свята, культура, народны, гульня, карагод, мерапрыемства, масавы, мастацтва, творчасць.

***N. Petukhova,***
*Candidate of Pedagogical Sciences, Associate Professor of the Directing Department of the Educational Institution "The Belarusian State University of Culture and Arts"*

# RECONSTRUCTION OF FOLK HOLIDAYS IN COOPERATION WITH THE BRANCH OF THE DEPARTMENT OF DIRECTING AT THE MUSEUM OF FOLK ARCHITECTURE AND LIFESTYLE (v. Azyartso)

**Abstract.** The article is devoted to the problem of recreating folk holidays in the museum of folk architecture and rural lifestyle by the staff and students of the Directing department. The author describes the museum’s working conditions, landscape and recreational features, which allow using its territory for the events of historical, folklore and ethnographic themes. In the article Analyzed ways of organizing folklore events: traditional and innovative, these ways reveal the specifics of developing scenarios of ritual complexes within the museum.

**Keywords:** museum, folklore, ritual, holiday, culture, folk, game, carousel, events, massive, art, creativity.

Адной з найбольш цікавых і вобразных форм захавання помнікаў традыцыйнай культуры з'яўляецца рэканструкцыя народных свят у музеях пад адкрытым небам – скансэнах, якія дазваляюць комплексна экспанаваць творы народнага дойлідства і мастацтва, прадметы побыту і прылады працы ў прыродным атачэнні, блізкім да натуральнага [3, с. 3].

У нашай краіне такі тып музея прадстаўлены ў першую чаргу Беларускім дзяржаўным музеем народнай архітэктуры і побыту (в. Азярцо, Мінская вобл.). Варта адзначыць музейны комплекс старажытных народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі» (Пухавіцкі р-н, Мінская вобл.), турыстычны комплекс «Горад майстроў» (г. Магілёў), этнаграфічны музей у п. Глуша (Бабруйскі р-н, Магілёўская вобл.) і іншыя ўстановы такога кшталту [2].

Прыцягнення цікавасці да скансэнаў іх кіраўнікі ўсё часцей дасягаюць праз прадастаўленне дадзенай тэрыторыі для правядзення мерапрыемстваў гістарычнай і фальклорна-этнаграфічнай тэматыкі. Прыкладамі служаць фестывалі «Вольнае паветра» на хутары Шаблі, «Шлях вікінгаў» на тэрыторыі парка гісторыі «Вялікае княства Сула», «Свята Сонца» і «Наш Грунвальд» на тэрыторыі музейнага комплексу старажытных народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі», міжнародны фолк-метал-фестываль «Купальскае Кола», што ў розныя гады праводзіўся на тэрыторыі Дукорскага маёнтка і парка Камарова, а з 2019 г. і ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, дзе з 2009 г. ладзіцца фолк-фэст «Каманіца» і інш.

Беларускі дзяржаўны музей традыцыйнай архітэктуры і побыту знаходзіцца недалёка ад в. Азярцо, якую ад г. Мінска аддзяляе ўсяго некалькі кіламетраў. Цікава, што ідэя стварэння музея пад адкрытым небам упершыню была выказана ў 1908 г. вядомым беларускім мастаком таго часу Фердынандам Рушчыцам, аднак ажыццяўленню гэтай задумы пашкодзілі неспрыяльныя гістарычныя абставіны, а менавіта дзве сусветныя вайны, якія памянялі прыярытэты зацікаўленых асоб [4]. У 1950–1960-я гг. у Беларусі інтэнсіўна вялося новае будаўніцтва, ствараліся аграпрамысловыя комплексы, паляпшаўся дабрабыт сяла і вызначаліся неперспектыўныя пасяленні. Узнікла рэальная пагроза страты помнікаў драўлянага дойлід-

ства і народнай матэрыяльнай культуры, у сувязі з чым пачынаючы з 1961 г. на старонках рэспубліканскага друку з'явіўся шэраг артыкулаў аб неабходнасці захавання помнікаў народнай архітэктуры і стварэння з гэтай мэтай музея пад адкрытым небам [1].

Дзявятага снежня 1976 г. Урадам Рэспублікі была прынята Пастанова № 367 «Аб стварэнні Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту», а для яе рэалізацыі загадам Міністэрства культуры арганізавана рабочая група, у склад якой увайшлі архітэктары, гісторыкі і этнографы. Пачалася вялікая навукова-экспедыцыйная праца па ўсіх рэгіёнах рэспублікі з мэтай вывучэння, пошуку, фіксацыі і перавозкі помнікаў народнай драўлянай архітэктуры, прадметаў побыту, рамёстваў і промыслаў музейнага значэння [Там жа].

З мэтай больш дакладнага акрэслення перспектыў музея ў якасці пляцоўкі для рэжысёрскіх мерапрыемстваў варта падрабязней спыніцца на яго канцэпцыі і структуры. Сёння ў склад экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ўваходзяць каля 40 аб'ектаў, частка якіх знаходзіцца на стадыі рэстаўрацыі [Там жа]. Гэта ўнікальны музей-скансэн пад адкрытым небам, дзе прадстаўлены помнікі народнага дойлідства з розных гісторыка-этнаграфічных куткоў Беларусі. Экспанаты музея – узоры тыповых вёсак Цэнтральнай Беларусі, Паазер'я і Падняпроўя XIX – пачатку XX ст. Помнікі народнай архітэктуры арганічна ўпісваюцца ў ландшафт зямельных участкаў, які падобны да мясцовага рэльефу прадстаўленых рэгіёнаў. У кожным экспазіцыйным сектары адметнасць прыродных аб'ектаў максімальна наближана да асаблівасцей тэрыторый адпаведных ім рэгіёнаў краіны. Ля сялянскіх хат растуць клёны, ліпы, бярозы, размяшчаюцца крыжы, студні, шпакоўні, вуллі – усё, як некалі было ў тым ці іншым рэгіёне. Зялёныя насаджэнні і малыя архітэктурныя формы, якія з'яўляюцца навуковымі рэканструкцыямі (агароджы, студні, арэлі і інш.) гарманічна дапаўняюць экспазіцыю, ствараючы комплекснасць і цэласнасць яе ўспрыняцця. Напрыклад, у сектары «Цэнтральная Беларусь» ландшафтныя кампазіцыі зялёных пасадак рэалізаваны па перыметры тэрыторыі музея, лакалізуючы візуальна тэрыторыі экспазіцый-сектараў: пароды дрэваў і хмызоў ствараюць фон архітэктурным

кампазіцыям альбо дапаўняюць аб'екты экспазіцыі (сядзібы, вуліцы, сцежкі і інш.) [Там жа]. Такім чынам, кожны экспазіцыйны сектар можна разглядаць як асобны рэгіянальны музей.

Дадаткова адзначым, што музей пад адкрытым небам – гэта не проста сховішча экспанатаў, а маляўнічы куток прыроды, дзе на велізарнай плошчы прадстаўлена прыблізна 43 % усёй айчыннай флоры. Акрамя таго, тут ёсць і важныя прырода-ахоўныя аб'екты – рака Пціч з Воўкавіцкім вадасховішчам і рака Менка, дзе знаходзіцца каштоўны археалагічны помнік Гарадзішча, гісторыя якога пачынаецца да нашай эры. Тут размешчаны і раннія помнікі – курганныя могільнікі, якія сведчаць аб тым, што гэта тэрыторыя была заселена са старажытных часоў. Курганы адносяцца да перыяду IX–XI стст. і размешчаны невялікімі групамі. Важным гістарычным аб'ектам з'яўляецца вёска Строчыцы, першы ўспамін аб якой сустракаецца ў дакументах XVI ст. На ўзвышаным беразе Пцічы захаваліся рэшткі фальварка з панскім садам і шэраг хат пачатку XX ст. з традыцыйным аздабленнем і фрагментамі агароджы.

Такім чынам, наведвальнікі маюць магчымасць не толькі пазнаёміцца з інфармацыйнай прасторай музея, але і адпачыць на прыродзе. Рэкрэацыйныя зоны паміж экспазіцыйнымі сектарамі прадстаўлены абсталяванымі маляўнічымі куткамі, летняй адкрытай кавярняй, пешаходнымі і коннымі дарожкамі [3, с. 35].

Беларускі дзяржаўны музей традыцыйнай архітэктуры і побыту праследуе мэту папулярызацыі традыцыйнай культуры і заахвочвання патэнцыйных наведвальнікаў, дзеля чаго яго супрацоўнікамі штогод ствараецца насычаная праграма мерапрыемстваў, сярод якіх сучасныя святочныя формы: тэматычныя і музычныя фэсты, прафесійныя святы, фестывалі гістарычнай рэканструкцыі, адмысловыя святочныя экскурсіі і шматлікія абрадавыя мерапрыемствы. Аналізуючы цяперашнюю насычаную праграму мерапрыемстваў скансэна, можна сказаць, што дзейнасць гэтай установы па працы з наведвальнікамі адначасова развіваецца ў адукацыйным (экскурсіі) і забаўляльным (святы і масавыя мерапрыемствы) напрамках. Прытым мерапрыемствы любога віду заўсёды ў пэўнай меры носяць культурна-адукацыйны характар.

Гэта адпавядае патрабаванням сучаснага грамадства, а таксама стварае ўмовы для рэалізацыі сумесных праектаў з кафедрай рэжысуры, прыкладамі якіх сталі фестывалі «Свята Каваля», «Восеньскі фэст», каляндарныя святы «Шчадрэц», «Тры каралі»; «Масленіца», ці «Святы Аўлас на бліны лас». Удзел у дадзеных мерапрыемствах студэнтаў кафедры рэжысуры з'яўляецца адным з кампанентаў іх падрыхтоўкі, у выніку якой адбываецца засваенне тэарэтычных ведаў, мастацкай інфармацыі, пры гэтым фарміруюцца прафесійныя ўменні і навыкі. Сумесная арганізацыя і падрыхтоўка разам з выкладчыкамі А. В. Катовіч, Д. П. Сяргейчуком, Ю. Д. Царэвічам свят, фестываляў, масавых дзеянняў, конкурсна-гульнявых і відовішчна-забаўляльных праграм здзяйсняецца двума шляхамі. Першы – традыцыйны, калі студэнцкі калектыў рыхтуе для дэманстрацыі той ці іншы абрад. Другі шлях – інавацыйны. Ён прадугледжвае даследаванне рэгіянальных асаблівасцей пэўнага традыцыйнага абраду, вывучэнне асобных яго элементаў (песень, танцаў, моўных выказванняў і інш.), распрацоўку абрадавага комплексу. Дадзены падыход, на наш погляд, адкрывае перспектывы для ўвядзення народных свят у кантэкст сучаснай культуры ў якасці эстэтычна пераасэнсаванай традыцыі. Праца кафедры вядзецца ў розных напрамках з мэтай развіцця мастацка-эстэтычных якасцей асобы – як саміх удзельнікаў, так і аўдыторыі гледачоў.

Кіраўніцтва музея таксама адзначае: такія імпрэзы садзейнічаюць павелічэнню колькасці наведвальнікаў, што патрабуе стварэння сістэмы падрыхтоўкі гідаў з веданнем замежных моў, а таксама прафесійнай падрыхтоўкі кадраў для правядзення мерапрыемстваў і свят на базе музея [3, с. 36].

Такім чынам, тэрытарыяльна-этнічная рэпрэзентатыўнасць Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту дае магчымасць комплексна і поўна прадставіць народную архітэктуру і матэрыяльную культуру краіны. На сёняшні дзень музей ажыццяўляе сваю дзейнасць у некалькіх напрамках: адукацыйным (экскурсіі) і забаўляльным (святы і масавыя мерапрыемствы).

Удзел студэнтаў кафедры рэжысуры ў фестывалях, масавых мерапрыемствах, конкурсна-гульнявых і відовішчна-забаўляльных праграмах з'яўляецца адным з кампанентаў іх прафесійнай падрыхтоўкі.

1. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://etna.by/museum/history.html. – Дата доступу: 16.01.2020.

2. *Киселёва, М. С.* Мини-скансен – неиспользованный потенциал архитектуры сельского туризма [Электронный ресурс] / М. С. Киселёва // Архитектура и строительные науки. – 2013. – № 1, 2 (14, 15). – Режим доступа: http://ais.by/article/mini-skansen-neispolzovannyy-potencial-arhitektury-selskogo-turizma. – Дата доступа: 06.03.2019.

3. *Локотко, С.* Белорусский скансен: проекты, реальность и перспектива / С. Локотко // Музеи Литвы и Беларуси: пути и перспективы развития в XXI веке : материалы конф., Минск – Вильнюс – Тракай, 2006–2007 / сост.: Е. Матевосян, В. Повилюнас, А. Сташкевич. – Минск [и др.], 2007. – С. 34–36.

4. *Шмелёв, В. Г.* Музеи под открытым небом / В. Г. Шмелёв. – К. : Наукова думка, 1983. – 117 с.

5. *Шмелёв, В. Г.* Этнографические музеи под открытым небом: научные принципы создания и история развития : автореф. дис. на соискание ученой степени канд. историч. наук: 07.00.07 / В. Г. Шмелёв ; Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы Академии наук БССР. – Минск, 1978. – 23 с.

УДК 378.147.091.33-027.22(-057.875)

***Н. Е. Петушко,***
*кандидат педагогических наук, доцент, доцент кафедры межкультурных коммуникаций и рекламы учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

## КОМПЛЕКСНЫЙ ПОДХОД И СИСТЕМНОСТЬ В ОРГАНИЗАЦИИ ВСЕХ ВИДОВ ПРАКТИКИ (на примере кафедры межкультурных коммуникаций и рекламы)

**Аннотация.** Автором выдвигается мысль о том, что комплексный подход с использованием межпредметных и межкурсовых связей в организации учебной, производственной (технологической) и преддипломной практики является эффективным инструментом систематизации и углубления знаний студентов, формирования у них профессиональных умений и навыков на каждом этапе обучения. Данный тезис раскрывается на примере модели практики, которая включает три этапа. Целесообразность последних подтверждена содержанием практики, наличием межпредметных и межкурсовых связей, организационными формами и практическими заданиями. Сделаны выводы о том, что моделирование практики студентов специализаций «менеджмент меж-